УДК 629.114.2

# АСАБЛІВАСЦІ ТРАНСПАРТНА-ЛАГІСТЫЧНЫХ СУВЯЗЯЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З СУСЕДНІМІ КРАІНАМІ Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

Студ. 101041-23 **Курман К. А., Міранчук Н. У.**
*Навуковы кіраўнік – ст. выкл.* ***Сінюціч К. В.***

З-за санкцый велічыня адлегласці перавозак грузаў на ўсход вырасла з 600 кіламетраў праз парты Літвы і Латвіі да 1000 і больш кіламетраў праз парты Расіі. Сталі карыстацца попытам маршруты паміж Беларуссю і такімі краінамі як Турцыя, Грузія, Казахстан, Узбекістан, Арменія. Найбольшыя аб’емы перавозак грузаў у кірунку пазначаных вышэй краінаў ажыццяўляюцца аўтамабільным і чыгуначным транспартам (транспартны калідор Поўнач-Поўдзень).

Пасля таго як істотна змяніўся аб’ем таваразвароту з заходнімі рынкамі праз санкцыі для Беларусі, асноўным напрамкам лагістыкі стаў Кітай, які цяпер з'яўляецца краінай з неабходнымі для Беларусі рэсурсамі. Паводле звестак мытнай статыстыкі за 2023 год, беларускі экспарт у Кітай вырас на 20 %.

Лагістыка Беларусі з Еўрасаюзам змянілася ў горшы бок. У пачатку 2023 года адзначылася падзенне попыту на грузаперавокі ў параўнанні з 2022 годам: Латвія – на 78 %, Германія – на 73 %, Літва – на 87 %, Польшча – на 85 %. Гэта звязана з увядзеннем пералічаннымі вышэй краінамі дадатковых абмежаванняў у дачыненні пэўных тавараў з Беларусі.

У пачатку зімы 2024 года Літва зрабіла больш жорсткімі правілы перасячэння мяжы грузавым транспартам з Беларусі.

Беларусь і Украіна ўнеслі змены ў міжурадавае пагадненне аб міжнародных аўтамабільных адносінах. У 2022 годзе Украіна спыніла працу пунктаў пропуску на беларуска-ўкраінскай мяжы.